Кошт паштовай перасылкі аплачана агулам.

Цана асобнага нумару 200.000 м.

ЗМАГАНЬНЕ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12 m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Выходзіць два разы у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1.500000 м.
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 300.000 мк., сярод тэксту 250.000 м. і на 4 стр. 200.000 м., за радок пэтыту у 1 шп.

№ 4 (25). Вільня, Чацьвер, 10-га студзеня 1924 г. Год II.

XIX Кангрэс P. P. S.

У Кракаве адбыўся XIX Кангрэс Польскай Сацыялістычнай Партыі (P. P. S.), які прыняў рэзалюцыі па розных пытаньнях; гэтыя рэзалюцыі і намячаюць тую тактычную лінію, якую будуць вясьці партыйныя ўлады ў бліжэйшыя дні сваей палітычнай працы, дзеля чаго нам трэба з імі крыху бліжэй пазнаёміцца.

Наперад трэба адзначыць, што на Кангрэсе выявілася моцная апазыцыя, на чале з п. Зарэмбай, якая выступіла з рэзкай крытыкай дасюлешняй тактыкі партыйных лідэраў, тактыкі, якая прывяла P. P. S. да фактычнага выслугоўваньня перад буржуазіяй, да падтрыманьня партыяй ня толькі несацыялістычных ці народных урадаў, але проста ўжо умеркавана-рэакцыйных, як габінэты Панікоўскага, Новака, Сікорскага і інш. Апазыцыя дамагалася перанясеньня цэнтру цяжару барацьбы на пазасоймавы грунт, бо толькі на гэтым грунце працоўныя клясы змогуць абараніць сябе перад усё ўзрастаючым наступам рэакцыйных сілаў у Польшчы.

На жаль, апазыцыя аказалася пакуль што яшчэ занадта слабай і складала ня больш як чацьвертую частку ўчасьнікаў кангрэсу. Большасьць пашла за старымі правадырамі партыі з п. п. Барліцкім, Марачэўскім і Недзялкоўскім.

Мы ўжо ня раз знаёмілі нашых чытачоў з палітыкай гэтай большасьці P. P. S., выявіўшайся ў дзейнасьці яе на соймавым і пасоймавым грунце і якая фактычна прычынілася да аслабленьня адпорнай сілы польскага пралетарыяту. Што-ж новага ўносяць рэзалюцыі Кракаўскага Кангрэсу ў палітыку P.P.S.? Як вядома, папярэдні Лодзінскі Кангрэс партыі забараніў P. P. S. уваходзіць у кампрамісы з буржуазнымі партыямі і тварыць у коаліцыі з імі ўрад. Партыя мела змагацца за работніцка-сялянскі ўрад і гэты лёзунг быў выпісаны ў загалоўку партыйнага органу „Robotnika“. Мы ўжо бачылі, як P. P. S. вяла гэтае змаганьне, падтрымліваючы проста антынародныя ўрады. Але і гэтага партыйным правадыром было мала. Галоўнае іхняе дамаганьне на Кракаўскім Кангрэсе было скасаваньне Лодзінскай ухвалы і даць партыйным уладам вольную руку ў тварэньні ўраду у паразуменьні з ня толькі сялянскімі партыямі, як Wyzwolenie і Пяст, але наагул з усякімі іншымі буржуазнымі партыямі, якія маюць „анты-правіцовы характар“, як заявіў п. Барліцкі ў сваім рэфэраце. Якія партыі лічыць п. Барліцкі „анты-правіцовымі“, вырозна сказана ня было, але, як ня трудна дагадацца, ён меў тут на відавоку тых самых хадэкаў з кс. Адамскім і Корфантым на чале, яўна рэакцыйнае абліччa якіх ні для кога не зьяўляецца сакрэтам. І мы можам спадзявацца, што ў бліжэйшыя дні можа ўтварыцца т. зв. „польская лявіцовая большасьць“ з P. P. S., Wyzwolenia, абодвых Пястаў, N. P. R. і Хадэкаў. Што можа даць для працоўнага народу ўрад, які будзе апірацца на гэткую большасьць, для ўсякага больш чым ясна.

Як бычым, лёзунг аб работніцка-сялянскім ўрадзе адсоўваецца ў далёкую будучыню. Высоўваецца лёзунг „людовага“ ўраду і то не як бліжэйшае заданьне, а так сама, як ідэал у будучыне. Цяпер-жа на парадак дня P.P.S. ставіць утварэньне антыправіцовага ўраду, які зьявіцца забясьпячэньнем перад узнаўленьнем ураду хьена-пяста ў тым ці іншым відзе. Як бачым, заданьні, як для сацыялістычнай партыі, дужа скромныя і тут мы можам сьмела сьцьвердзіць аканчальнае банкруцтва ідэолёгіі і палітыкі P. P. S. І гэта зусім зразумела. Раз стаўшы на пахілую плошчу ўгоды з буржуазіяй, P. P. S. мусіць каціцца па ёй ўсё ніжэй у балота дробнамяшчанскіх ідэалаў.

Такое-ж нявыразнае становішча заняў Кангрэс і адносна двух другіх пытаньняў, якія нас асабліва цікавяць,—у пытаньнях аб нацыянальнай і зямельнай палітыцы. З прычыны асаблівай важнасьці гэтых пытаньняў мы яшчэ вернемся да разгляду іх на шпальтах нашай газэты, цяпер-жа толькі падкрэсьлім найбольш характэрныя рысы гэтых рэзалюцыяў.

Прызнаючы тэорытычна права нацыяў на самаазначэньне, Кангрэс P. P. S. у сваей рэзалюцыі, якую ніжэй друкуем, дамагаецца толькі „тэрыторыяльнай аўтаноміі для меншасьцяў, якія засяляюць абшары на ўсходзе Рэспублікі з захаваньнем правоў польскага насяленьня“. Як відаць з рэфэрату п. Недзялкоўскага, гэтае права на аўтаномію прызнаецца выключна толькі за украінцамі ўва Усходняй Галіччыне і на Валыні. Адносна да беларусаў п. Недзялкоўскі робіць агаворку, што „беларускае грамадзянства аднак павінна перайсьці праз самаўрадовую арганізацыю да аўтаноміі“, тлумачачы гэта тым, што беларусы слаба арганізаваны. Гэтая агаворка адразу перачырківае нават тое, на што здабыўся пан Недзялкоўскі ў рэзалюцыі і зьяўляецца запаведзяй таго, што ўсё застанецца па старому, бо невядома як доўга нам трэба будзе чакаць, калі пан Недзялкоўскі міласьціва выдасьць нам атэстат палітычнай і грамадзкай сьпеласьці.

За тое шмат увагі зварочвае рэзалюцыі і яе тварэц на „нацыяналістычныя цячэньні“ сярод беларусаў і украінцаў і інш. нацыянальных меншасьцяў і заклікае да бязьлітаснае барацьбы з гэтымі цячэньнямі, забываючы, што нават буржуазны вызваленчы нацыянальны рух паняволенага народу мае паступовы характар і зьяўляецца ў пэўнай меры саюзьнікам пралетарыяту ў яго барацьбе за вызваленьне, бо аслабляе сілы буржуазіі пануючай нацыі. Я думаю, ніхто гэтага лепш не ведае, як сама P. P. S., хай толькі ўспомніць тыя часы, калі яна сама змагалася за вызваленьне польскага народу з заборчымі ўрадамі.

Найбольш скандалічным можна лічыць разьвязаньне зямельнага пытаньня Кангрэсам P. P. S. Апрацаваная п. Квапінскім рэзалюцыя павінна была адыграць толькі агітацыйную ролю, што нават было падчыркнута ў дыскусіі. Гэтая „агітацыйная рэзалюцыя“ пакідае абшарнікам па 180 гэктараў і прадбачыць надзел безьзямельных і малазямельных сялян зямлёю, вартасьць якой павінна быць выплачана ў працягу 30 гадоў. Але для большасьці кангрэсу і гэта паказалася занадта радыкальным і пасьля дыскусіі прынята туманная рэзалюцыя, даручаючая пэпэсаўскім паслом апрацаваць праект закону аб зямельнай рэформе.

Гэты страх выявіць сваё запраўднае абліччa у адносінах да так палючага ў Польшчы зямельнага пытаньня характарызуе, як ня трэба лепш, партыю, якая мае прэтэнзію лічыць сябе адзінай прадстаўніцай інтарэсаў працоўных масаў.

Кумельган.

Насьпеушая патрэба.

Нацыянальная сьвядомасьць беларускіх працоўных масаў можна сказаць, што ужо ўваскросла саўсім і наступае за гэтым іншы момант, момант *сьвядомасьці сацыяльнай*. На жаль, гістарычна варункі жыцьця нашага народу злажыліся так, што нацыянальная няволя яго зьнікае там, дзе раней ён дасягнуў сацыяльнага вызваленьня. І кожнаму ясна цяпер, што да поўнапраўнага нацыянальнага жыцьця нашыя працоўныя масы прыдуць ніяк не раней, чымся пасьля рашучых сацыяльных пэратурбацыяў, бо як ні вары свой нацыянальны кісель, а ён заўсёды будзе горкім, пакуль капітал (усе прылады вытвару, а ў тым ліку і зямля) будзе знаходзіцца ў руках буржуазіі і абшарнікаў, для нашага народу абсалютных чужакоў і ворагаў яго, як сацыяльна-клясовых, так і нацыянальных. Грунтоўны пралетарыят Заходняй Беларусі—безьзямельныя дворныя парабкі, малазямельнае сялянства ды фабрычна-мястовыя работнікі павялічаюцца ў сваіх радох зьнішчаным эканамічна элемэнтам вялізнай масы прыбыўшых з голымі рукамі з выгнаньня ўцекачоў, якія ў большасьці сваёй прабываюць у жабрацтве, ня маючы за што рук зачапіць. Паўпэрная (зьбяднеўшая ад беспрацоўя) народная інтэлігэнцыя або эмігруе на ўсход, або павялічае на месцы рады бяздольных.

Хто-ж думае аб балючым палажэньні гэтых масаў? Хто дзе і як іх бароніць?

Адказ цяжкі. Бо дасюль востраю застаецца саўсім насьпеўшая патрэба гэткае клясавое арганізацыі, якая адбівала-б, як у люстры, інтарэсы тае бяздольнае беларускае масы, якая у імя жыцьцёвых інтарэсаў сваіх, заўсёды будзе служыць натуральным апірышчам, як для кожнага запраўднага беларускага дзеяча ці палітыка, так і для кожнага, таго ці іншага, беларускага выступленьня за патоптанае права. Сама сабою вынікае патрэба стварэньня *беларускае рабоча-сялянскае сацыялістычнае партыі* з праграмаю, якая на першым пляне ставіла-б задачы сацыяльнага вызваленьня, паняволенай цяпер, працоўнай беларускай бедноты.

Бо куды-ж цяпер туліцца дворны парабак польскага пана, безьзямельны пролетары-беларус, як не пад крыло прафэсыянальнага саюзу пад павадырствам сацыяль-лёкайскае партыі P.P.S.? Куды горнецца малазямельны селянін-беларус і безьзямельны арэндатар, як не да *польскае* народнае партыі „Wyzwolenie“? Лепей якая-небудзь радыкальная народная праграма, лепей якая-небудзь бліжэйшая акрэсьленая мэта, як ніякай. Гэтак разважае працоўная наша беднота і, не знаходзячы свае роднае, блізкае ёй арганізацыі, ідзе ў чужацкую, якая заўсёды наперадзе ставіць свой „моцарствовы“ нацыяналь-патрыятызм і інтэрас „przyrodzonego gospodarza“ дзяржавы, а пасьля ўжо туманіць голаву масам сваею праграмай, не пазбаўленай пэўнага сацыяльнага радыкалізму. Сацыялісты украінскія, йдучы заўсёды наперадзе за нас, аб'ядналіся ў моцную клясовую арганізацыю „Соцыяль-дэмакратычную Рабочую Партыю“, якая даўно мае грунт у масах б. аўстрыяцкае Украіны. Добры прыклад! У нас няма „старое“ сацыялістычнае партыі тут, у Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы. Псыхолёгічная маса эс-эраў разьляцелася ў пыл, існуючы хіба дзе нелегальна. „Сацыяль-Дэмакратычная Партыя“, ці правільней група некалькіх „добрых грамадзян“ інтэлігэнтаў *нічога сацыялістычнага* не пра-

явіла і няма ведама, дзе жыве. Да таго-ж і ў сацыялістычнасьці яе заўсёды чуваць было або крыху касьцельнага ладану, альбо пагасаўшых царкоўных сьвечак. Разьвінуцца яна так і не магла. А цяпер ужо нашыя працоўныя масы не прадстаўляюць сабе сацыялістаў, як у 1905 годзе, нейкімі тэрорыстамі, або падпольшчыкамі панскіх двароў,—яны ўжо пачынаюць разумець адкуль ідзе іхняя шчырая абарона і што такое наагул свая ўласная арганізацыя. Добра было-б, каб тыя з сяброў беларускага прадстаўніцтва ў польскім парлямэнце, якія ня толькі думаць могуць, як сацыялісты, але й робяць так, як думаюць, праявілі пэўную ініцыятыву, як людзі, пастаўленыя ў выгаднейшыя варункі для гэтае працы. Гадавая палітычная практыка іх у польскім Сойме павінна ўжо іх навучыць, што спадзявацца на паноў пэ-пэ-эсаў ды вызваленцаў няма чаго, бо ў праграме іхняй адно, а ў тактыцы—„пілсудчына“. Лёзунг P.P.S. аб рабоча-сялянскім урадзе прызначаны для вулічнага ўжытку ў сьвяточныя (мітынговыя) дні, ў габінэце-ж хоць-якога пэ-пэ-эса кайданы для беларускіх працоўных масаў заўсёды закоўваюцца мацней. „Вызваленьне рабочых—справа самых рабочых!“ Гэта павінен памятаць кожны шчыры беларускі палітык і, згодна з гэтым лёзунгам, намеціць шлях свае дзеяльнасьці. А патрэба дзеяльнасьці насьпела.

К. М.

Рэзалюцыя

у справе нацыянальнай палітыкі, прынятая на XIX кангрэсе P. P. S.

1. XIX Кангрэс P. P. S. сьцьвярджае, што нацыянальная справа сталася адной з найхутчэй дамагаючыхся разьвязаньня задачаў у дзяржаўным і грамадзкім жыцьці Польшчы. З мамэнтам устанаўленьня граніц Рэспублікі разьвязаньне гэтае залежыць ад самадзельнага высілку польскай палітыкі. Дасюлешняя дзейнасьць розных габінэтаў была напоўнена ўплывамі нацыяналізму; канстытуцыя ня ўведзена ў жыцьцё; наадварот, стасавалася сыстэма рэпрэсіяў і прасьледаваньняў адносна да працы і арганізацыі нацыянальных меншасьцяў у рознародных галінах, а асабліва на Усходніх Землях, дзе украінцы і беларусы засяляюць сплашныя абшары, як большасьць люднасьці. Габінэт-жа Вітаса і Корфантага, які ўрадова прадстаўляў ідэолёгію польскага нацыяналізму, давёў адносіны да яшчэ большага абвастрэньня.

Гэткае палажэньне рэчаў робіць з Польскай Рэспублікі арэну няўпыннай нацыянальнай барацьбы, тамуе разьвіцьцё работніцкага руху, становіцца ўпоперак імкненьняў да дэмакратызацыі дзяржавы, узмацоўвае рэакцыйныя сілы ў польскім грамадзянстве, а з другога боку ўзмацоўвае нацыяналістычныя цячэньні ў грамадзянствах меншасьцяў, даючы перавагу нацыяналістычна-клерыкальным кірункам сярод украінцаў і беларусаў, гакатыстычна-юнкерскім сярод немцаў, сыяністам сярод жыдоў.

У гэткіх варунках P.P.S. павінна ўзяць на сябе ініцыятыву зрушыць справу з мёртвага пункту. Заканчэньне нацыянальнай барацьбы, стварэньне адносінаў, у якіх нацыянальныя меншасьці знойдуць поўную свабоду нацыянальна-культурнага разьвіцьця, у якіх можа быць магчымым мірнае і брацкае іх сужыцьцё з народам польскім, зьяўляецца абавязкам польскага сацыялізму, ляжыць у інтарэсах дэмакратыі і гістарычнай будучыны Дзяржавы.

Выходзячы з вышэйсказаных палажэньняў Кангрэс заклікае кіраўнічыя партыйныя ўлады, а асабліва Пасольскі Клюб P.P.S., каб распачалі рашучую і энэргічную акцыю на прадмет:

а) поўнага і запраўднага раўнаўпраўненьня ўсіх грамадзян Рэспублікі бяз розьніцы веры і нацыянальнасьці;

б) неадкладнага ўвядзеньня ў жыцьцё артыкулаў канстытуцыі, гварантуючых нацыянальным меншасьцям іх правы культуры, мовы і школы; наглядаць, каб пры падзеле субвэнцыяў і стыпэндыяў школьных праз Дзяржаву гміны і іншыя самаўрадавыя арганізацыі, прыймаліся пад увагу толькі ровень гэтай школы, сьвецкі, неклерыкальны характар навучаньня і г. д. а ня тое, якая мова зьяўляецца выкладоваю, якой нацыянальнасьці і рэлігіі школа; заснаваньне украінскага ўнівэрсытэту ў Львове;

с) поўнага спыненьня палітыкі адміністратыўных прасьледаваньняў, і заслугоўваючых на найвышэйшае заклеймленьне рэлігійных ці нацыянальных прасьледаваньняў, рэарганізацыя і направа адміністрацыі на ўсходніх землях;

d) увядзеньня на т. зв. усходніх крэсах гміннага самаўраду ў гарадох і на вёсках, павятовага і ваяводзкага; дапушчэньне грамадзян Рэспублікі з нацыянальных меншасьцяў да дзяржаўнай адміністрацыі ўва ўсіх галінах;

е) правядзеньне зямельнай рэформы, згодна з пастулятамі P.P.S.;

f) тэрыторыяльнай аўтаноміі для меншасьцяў, якія засяляюць сплашныя абшары на ўсходзе Рэспублікі з захаваньнем правоў польскай людласьці.

II. Кангрэс прымае да зацьвярджаючага ведама крокі Цантр. Выкан. Камітэту, якія маюць замер устанавіць сталы кантакт паміж P.P.S. і сацыялістычнымі арганізацыямі і групамі нацыянальных меншасьцяў. Адначасна Кангрэс падчырківае з поўным націскам, што таксама, як абавязкам польскага сацыялізму зьяўляецца барацьба з польскім нацыяналізмам, такі самы абавязак ляжыць на дэмакратыях: украінскай, беларускай, нямецкай і жыдоўскай адносна да нацыяналістычных і клерыкальна-рэакцыйных цячэньняў у іхніх грамадзянствах.

Кангрэс упаважняе кіраўнічыя партыйныя ўлады да далейшай працы ў гэтым кірунку.

Значэньне француска-чэхаславацкага саюзу.

Саюз Францыі з Чэха-Славакіяй, які спрытны п. Бэнэш падараваў „па gwiazdkę“ Эўропе, а якога нія-к ня можа ператравіць польская прэса, зьяўляецца вельмі важным, можна бяз перахвату сказаць—усеахоплівакючым, калі не паваротным фактам у жыцьці г. зв. Сярэдняе Эўропы;—адгукаецца нават, як пабачым далей, і на нашых „крэсовых“ адносінах... Дзеля таго, паходжаньне, зьмест і значэньне гэтага новага саюзу трэба сабе добра ўсьведаміць і беларускаму грамадзянству.

Паскольк мы можам судзіць з тых адарваных вестак, якія далятаюць да нас з запраўднай Эўропы праз „нацыянальныя фільтры“ польскай прэсы, цэлая справа прадстаўляецца ў гэткім відзе.

Перад усім рашучым мамэнтам для перагляду ўсіх бяз вынятку вартасьцяў сучаснай „Вэрсальскай Эўропы“ зьяўляецца, як мы ўжо казалі ня раз, узварот да дому на свае месца ў рэальнай Эўропе „Расеі“, якая, як ведама, вэрсальскімі „жаніхамі Пэнэлёпы“ лічылася ўжо зусім „бяз весьці прапаўшай“...

З гэтым узваротам „Расеі“ на месца, якое, паводле „знамянітай концэпцыі „Польшчы Пілсудскага“ а таксама і „Rzeczpospolitej“ Стронскага“, павінна была заняць вялікая, „моцарствовая“ Польшча з аднаго боку, а з другога, — цяпер ужо усім і зусім відавочным правалам гэтай ідэі — стварылася для тых, хто перадусім і больш за ўсіх карыстаецца „дабрадзействам“ Вэрсальскай Эўропы, для яе запраўдных паноў і падпанкаў зусім новае палажэньне...

Як ведама, з усіх падпісаўшых Вэрсальскі Трактат дзяржаваў бязумоўна і да канца на абароне яго духу і літары стаіць ужо адна толькі Францыя, ня лічачы яе, ня маючай уласнай палітыкі, саюзьніцы Польшчы, на якую Францыя ў значнай меры апіралася ў стварэньні сваей гэгэноміі ў Эўропе.

„Але, як мы казалі, моцарствовая сіла гэтай саюзьніцы аказалася ў вялікай меры нерэальнай; „Польшча Пілсудскага“, ўся „левая палова Польшчы“ яўна збанкрутавала...—Пасьля вялікага краху ў 1920 г. якраз і йшоў працэс давядзеньня гэтага банкруцтва да відавочнасьці... Але да апошніх часоў аставалася ў рэзэрве яшчэ „правая палова Польшчы“, — „Польшча Дмоўскага“... Аб гэтэй „запраўднай Польшчы“ правіца стварыла цэлую лягенду... — „Польшча Пілсудскага“ была „няшчырай саюзьніцай Францыі“, бо Пілсудскі—„быўшы аўстра-нямецкі актывіст“, „скрыты гэрманафіл і вораг Францыі“... А вось правіца і яе Польшча—наймацнейшая ў сьвеце апора Францыі!..

І вось 7 месяцаў урадаваньня правіцы,—рэалізацыі ўсіх магчымасьцяў гэтай „Польшчы Дмоўскага“—да канца і на вечныя часы разьбілі і разьвеялі ў прах гэтую лягэнду...

І чым мацней верыла ў гэтую лягэнду Францыя, тым больш жорстка апынулася перад рэальнасьцю... Як і першая—„левая“, таксама і другая — „правая“, абяцаўшая Францыі безпараўнаньня большую апору, палова „моцарствовай Польшчы аказалася перадусім таксама нерэальнай, — ня маючай сілы, аўтарытэту і трываласьці... Наскольки „Францыя п. Пуанкарэ“ верыла ў гэтую правую Польшчу, відаць хаця-ж бы з таго, што правал ураду Хьена-Пяста зрабіў у Францыі найгоршае прыгнятаючае ўражаньне...

„Як-жа гэта?—пісалі француськія газэты,—у часе, калі Францыя дае сваёй саюзьніцы 400 мільёнаў франкаў на „яе“ абарону, яна зьмяняе найбольш францускі з сваіх урадаў на менш прыхільны да Францыі“?!.

І вось правал і моцарствова-палітычная ліквідацыя „лявіцовай Польшчы“, як мы ўжо пісалі, зьяўлялася першым важнейшым крокам на ўсходзе да выхаду з Вэрсальскай Эўропы, першым крокам Польшчы да нейкай рэальнасьці... Правал другой „правіцовай“ палавіны Польшчы „зьяўляецца другім крокам да гэтай самай мэты, — да выхаду ў запраўднае русло гісторыі з Вэрсальскіх „батлеяк“...

З абодвух гэтых бязспрэчных і відавочных фактаў нашай гісторыі гэтых 6 гадоў Францыя, ратуючы сваю безнадзейную ў канцы канцоў гэгэмонію ў Эўропе і зрабіла адпаведны вывад: знайшла сабе больш сталага і трывалага саюзьніка, паставіўшы новую стаўку на Чэхаславакію. З гэтага, важнейшага для нас пункту гледжаньня, франка-чэскі саюз зьяўляецца трэцім крокам, трэцім важным этапам на шляху сучаснай Эўропы да большай рэальнасьці.

Як мы ужо пісалі, Польшча ня можа быць ані мастом ані бар'ерам паміж Эўропай і С. С. Р. Р. і дзеля таго ўся тая запраўды „вялікая палітыка“, якую праз Польшчу манілася вясьці Францыя, аказалася нерэальнай...

Бар'ерам Польшча ня можа быць, бо, як гэта зусім ясна ўжо нават і для яе нарэшце празрэўшым публіцыстаў і палітыкаў: папросту на гэта ў яе ня хапае і ня хопіць сілы. Як цяпер ужо ўсім ясна, уся тая камбінацыя Балтыцка-Польска-Румынскага плоту, які павінен быў аддзяляць „С.С.Р.Р.“ ад Эўропы, як і трэба было спадзявацца, разваліўся ў прах: усе бяз вынятку часьціны гэтага бар'еру лічаць больш пажаданымі ўсе „небясьпекі“, пагражаючыя ім з боку зусім рэальнага і ўсё больш рэалізуючагася „С.С.Р.Р.“,—чым ўсе тыя „вэрсальскія дабрадзействы“, якія абяцала ім ганаровая, але руйнуючая перад усім іх уласную эканамічную, а патым і палітычную рэальнасьць — роля „бар'ера“ пад „гэгэмоніяй Польшчы на Ўсходзе Эўропы“.

Ад усей гэтай вялізарнай концэпцыі асталася толькі можа гучная, але зусім пустая фраза аб нейкім „прадмуры эўрапэйскай культуры“, аб „збаўляючым Эўропу ад „усходняга барбарства“ „абаронным вале“...

Але-ж у сучаснай Польшчы не хапіла таксама ані сілы ані палітычнага рэалізму, ані запраўднай самастойнасьці і незалежнасьці—каб стаць запраўдным мостом, запраўдна патрэбным усім шляхам паміж гэтымі Усходам і заходам Эўропы. Як сама створаная „вэрсальскімі хірургамі“ Польшча, таксама і перадусім яе творцы зрабілі ўсё магчымае, каб яна ніколі і прынцыпова не магла зрабіцца гэтым мастом... І вось, як мы ўжо пісалі, сучаснай Польшчы астаецца, пасьля ўсіх сноў і лятуценьняў аб „моцарствовасьці“,—„вялікадзяржаўнасьці“, каштаваўшых ёй столькі, як відаць цяпер зусім бескарысных, ахвяраў,—астаецца вельмі скромная роля палітычнай правінцыі...

Што перакладаць на беларускую мову.

(Глядзі № 2 (23) „Змаганьня“).

Гаворачы аб расейскай літэратуры трэба адзначыць, што тут мы ня знойдзем гэткіх аўтараў, якія-б пераважную частку свае творчасьці пасьвяцілі беларускаму быту. Цяпер, калі пяройдзем да польскіх аўтараў, апісваючых Беларусь і беларусаў, то прадусім мусім адзначыць адзін надта характэрны факт, з якога адначасна пераканаліся, што вялікшая зацікаўленасьць беларускім бытам, якую бачым ў польскай літэратуры, ў параўнаньні да маскоўскай, зусім ня была прыпадковай, а лёгічна выплывала з цэлага комплексу гістарычна склаўшыхся абставін,—гэны факт, гэта тое, што вялізарная большасьць вышэйпамянёных аўтараў ня была запраўднымі каранымі палякамі, а складалася з прадстаўнікоў спольшчаных беларускіх (а падчас літоўскіх) шляхоцкіх родаў.

Гэныя людзі, хоць і былі ўжо значна спольшчанымі, аднак зусім пазбыцца „беларускага караню“, вырваць яго з свае душы і натуры ня мелі магчымасьці, раз, што ён глыбока сядзіць, а два, што гэнаму перашкаджала, жыцьцё сярод беларускае прыроды, побач з беларускай вёскай, на беларускай зямлі, з якой яны былі зьвязаны праз свае двары на вёсцы, або дамы ў горадзе; гэны-ж факт, выклікаў ў свой чарод тое, што памімаўсе „польскасьці“, гэная, акружаўшая іх беларуская атмосфэра, якую яны апісывалі ў сваіх творах, заставалася для іх і далей роднай, блізкай сэрцу і бліжэйшай чымсьці польская, адлучкі-ж у караную Польшчу, або заграніцу, ня толькі ня шкодзілі, але на'т былі карыснымі, бо выклікаючы тугу па родным краі, яшчэ больш прывязывалі да яго гэных людзяў.

Гэткім чынам, мы выясьнілі, што большая зацікаўленасьць беларусамі ў польскай літэратуры чымсьці ў маскоўскай выклікана ня толькі праз валаданьне Беларусяй, колькі праз спольшчаньне шляхоцтва апошняй і калі-б ня гэта, запраўды—польская літэратура аб беларусох, пэўна-ж была-б не багацейшая за маскоўскую.

Аб гэтых аўтарах са спольшчаных беларусаў надта цікаўныя і аб'ектыўныя рэчы казаў пан Массоніус, прафэсар Віленскага Унівэрсытэту ў сваіх лекцыях пад назовай: „Псыхолёгія народаў“, дзе, кажучы аб беларусах і украінцах, зьвяртаў увагу слухачоў на той вялікі і цэнны ўклад ў скарбніцу польскае культуры ўнесены праз спольшчаных прадстаўнікоў гэных двух народаў між іншым і ў краіне літэратурнае творчасьці.

Даволі будзе ўспомніць, што першыя далі Міцкевіча, а другія—Славацкага, гэных волатаў польскага рамантызму дый наагул сусьветнае літэратуры.

Колькасьць гэных пісьменьнікаў так значна, што праф. Массоніус знаходзіць адпаведным і патрэбным ужыць ў адносінах да іх тэрмін „літэратурная школа“ і кажа аб „украінскай“ і... „віленскай“ (?) школах польскае літэратуры.

Калі скажам замест „віленскай“—„беларускай“, дык будзе ўжо зусім добра, бо інакш дык трэба казаць замест „украінскай“—аб „львоўскай“ школе!

Апрача таго, той самы, здаецца, прафэсар, казаў аб тых магутных зьменах, якія выклікаў у польскай душы кантакт з беларуска-украінскім элемэнтам і ягонымі звычаямі і сьветаглядам пасьля дзяржаўнага злучэньня праз Унію з В. Кн. Літоўскім. Ён кажа, што пачаткова польскі дух і характар быў цьвёрды, бадзёры, ваяўнічы і вясёлы і, толькі дзякуючы гэнаму падабенству ягонаму да гэрманскага, палякі ня згінулі ў барацьбе з імі, як іншыя славяне.

Але пасьля далучэньня сучасных „kresów wschodnich“, ў польскую дасюль гартоўную душу закраліся і апанавалі яе аснаўныя, складовыя часьці беларуска-украінскае псыхолёгіі—сьпеўнасьць, лагодная мэлянхолія і бясконцы сум, нуда, туга па чымсь наведамым, імглістым, далёкім... і апанаваная імі польская цьвёрдая і бадзёрая душа, затраціла сваю колішнюю моц і гарт і расплылася бязьсільная, бязвольная па гэным бязьмежным усходнім прасторам і, будучы ўжо няздольнай да барацьбы і змаганьня, дачакалася ў канцы балючых падзелаў свае Бацькаўшчыны...

Калі прыглядзімся да гэнай „віленскай“ ці лепш „беларускай“ школы, ўбачым, што яе аўтараў можна падзяліць на старэйшых і малацзейшых. Першыя — апісваюць Беларусь „кантушовую“ або—стара-шляхоцкую, малюючы ўсе прынады і заганы жыцьця тагачасных спольшчаных беларуска-літоўскіх паноў і паўпанкаў з выразнай да іх сымпатыяй і ідэалізуюць бязкрытычна гэную эпоху, другія — адтва[illegible]юць сучаснае

Француска-чэскі саюз якраз і зьяўляецца фактам, які ў значнай меры зводзіць Польшчу да гэтай яе запраўднае „гістарычнае ролі“...

Ува ўсякім выпадку ня можа быць ніякага сумліву ў тым, што ён ня столькі дапаўняе, сколькі замяняе саюз француска-польскі, у значнай меры, а можа ўжо і прынцыпова зьмяняючы ўвесь кірунак і характар францускай палітыкі на Усходзе Эўропы... Для гэтай новай палітыкі Францыі, як можна думаць, якраз патрэбны запраўдны мост паміж Эўропай і „С.С.Р.Р.“, для якой ролі, як мы бачылі Польшча, аказалася няздатнай, але да якой як найбольш адпаведнай якраз і зьяўляецца Чэхія... Пералом адносінаў паміж Францыяй Радзвай Расеяй бяз сумліву адаб'ецца і тут... І мы ведаем, што амаль ня самая распаўсюджаная франц. газэта „Petit Parysien“ якраз і выражае гэты зьмест чэска-француcкага саюзу, кажучы, што ён можа „здалее ў будучыне адыграць ролю мосту паміж Масквою і Парыжам“... Здалее, можа, зрабіць тое, чаго не здалела зрабіць няўдалая „франка- і русафільская“ „Польшча Дмоўскага“—з сваей „наіўнай“, каб не сказаць мацней, „традыцыйнай“ ідэяй „саюзу Францыі, Польшчы і Расеі“... Няведама толькі з якой „Расеяй“, бо з усімі „Расеямі“, якія толькі мысьлімы, з выняткам толькі варшаўскай „Расеі п. Філёзофава“. Польша, як п. Пілсудскага таксама і п. Дмоўскага, здалела стварыць адносіны горшыя, як паміж катом і сабакам...

Француска-чэхаславацкі саюз як быццам падводзіць баланс (ітог) шасьці гадоў істнаваньня адраджонай Польшчы...

Вось—гэты ітог, каротка паўтараючы, усё што сказана вышэй. Збанкрутаваўшая левая палова Польшчы, Польшча Пілсудскага не здалела стаць бар'ерам паміж С.С.Р.Р. і Эўропай... Таксама збанкрутаваўшая „правая палова Польшчы“, „Польшча Дмоўскага“ не здалела стацца мастом паміж Заходам і Усходам Эўропы...

Таму, што цяпер асталося ад гэтых дзьвюх палавін больш дзелавой і рэальнай, але ўсё-ж яшчэ ўпорна „нацыяналістычнай Польшчы Грабскага“ асталася зусім рэальная роля—„правінцыі“, у старане ад вялікіх сусьветна-гістарычных шляхаў і палітычных падзеяў людзкасьці...

Але-ж няма худа бяз дабра...—Якраз страціўшы хваравітую пыху „вялідзяржаўнасьці“, пакінуўшы ролю пакорнага васала трагічна хворай на гэтую хваробу Францыі, Польшча пачуе ў сябе запраўды людзкія розум, пачуцьцё і волю і стане запраўды самастойнай і незалежнай, бо стане шукаць апоры толькі ўнутры сябе... Што гэты няўхільны працэс запраўднай санацыі і запраўднага адраджэньня ўжо пачаўся, ёсьць, можа, йшчэ вельмі нялічныя, але зусім нясумліўныя азнакі...

Аб гэтым яскрава кажа, напр. артыкул у № 3 „Kur. Polski“.—„Polityka Sezonowa“...

І зусім зразумела, што толькі гэтая новая Польшча можа здалее, шукаючы апоры ўнутры, ажыцьцёвіць паразуменьне з сваімі нацыянальнымі меншасьцямі зразумее і нас беларусаў, калі гэта ёй суджана яе гістарычным лёсам, які, як ведама, кожны народ стварае сабе сам.

Але аб гэтых вельмі цікавых азнаках і „выніках“ апошняга паражэньня чэска-француcкага саюзу варта пагаварыць асобна... **С.**

Палітычныя падзеі.

ПОЛЬШЧА.

Вядомы правіцовы дзеяч, граф М. Замойскі, быўшы кандыдат „Хьены“ пры выбарах прэзыдэнта Рэспублікі, конкураваўшы з п. Войцехоўскім, прыняў запрапанаваны яму прэм. Грабскім пост міністра загр. спраў.

Міністрам сельскай гаспадаркі назначаны п. Яніцкі, мөўшы ўжо гэты партфель у 1919 г. Ці гэта значыць, што зямельная рэформа скранецца з мёртвага пункту, няведама.

На канфэрэнцыі ў Прэзыдэнта Рэспублікі высьветлілася, што Маршалак Пілсудскі ня будзе назначаны шэфам генаральнага штабу, як ён хацеў. Ад запрапанананага яму паста начальніка Ваеннай Рады Пілсудскі адмовіўся сам.

Пры браме ваеннага вастрогу ў Варшаве варта схапіла бамбіста, які, як дазналіся ў паліцыі, меў намер са сваімі супольнікамі адбіць і высвабадзіць ахвіцэраў-бамбістаў Вечаркевіча і Багінскага ў часе іх падарожы з турмы ў апэляцыйны суд.

Ізноў паднята аплата лістоў на пошце. Звычайны ліст на будучы тыдзень будзе каштаваць 125.000 мар. польск. Пасьля 15-га цана падымецца ізноў.

Заграпічны пашпарт ад І/І ужо каштуе 15 франкаў у золаце.

Памёр вядомы і самы заядлы эндэцкі пасол ксёндз Лютаслаўскі, адзін з найпрагавіцейшых жываедаў „нацыянальных меншасьцяў“, аўтар вядомых керніка-паліцэйскіх законапраектаў, зьнішчаючых дарэшты Польскую Канстытуцыю. Са сьмерцю кс. Лютаслаўскага з пасьці Хьены выпаў адзін з самых вострых-лютых і ядавітых зубоў... Але „аб нябошчыку або нічога, або ўжо... добра!“ — як кажа лацінская пагаворка...

Ад І/І з усіх крамаў павінны быць выкінуты расейскія фунты, а заведзены гіры ў кілёграмах. За нарушэньне загаду — вялікі штраф.

3/І Прэзыдэнт Польск. Рэспублікі прыняў паўнамоцнага пасла С.С.Р.Р. у Польшчы п. Оболенскага, які замяніў на прыёме сваі граматы, прадстаўніка Р.С.Ф.С.Р. на новыя, як пасла С.С.Р.Р. Пасьля афіцыяльнай цэрамоніі Прэзыдэнт прыватна гутарыў з паўнамоцным міністрам Саюзу С. С. Р. Р.

НЯМЕЧЧЫНА.

На акупаваным абшары Руры ад 4/І уведзены цэлы рад палягчэньняў і аддаңы загад аб вывядзеньні 7 палкоў пяхоты. Францускія ўлады абяцаюць і далейшыя палёгкі.

Баварыя ізноў рашуча дамагаецца ад цэнтральнага ўраду Нямеччыны перагляду агульнадзяржаўнай канстытуцыі ў напрамку вялікшай самастойнасьці пасобных частак фэдэрацыі.

Закон аб надзвычайных паўнамоцтвах баварскаму ураду для аздараўленьня фінансаў і барацьбы з „нелегальнымі арганізацыямі“—прайшоў праз камісію Сойму.

АНГЛІЯ.

У Англіі, відаць, усе ўжо пагадзіліся з тым, што ўладу возьме ў свае рукі Работніцкая Партыя. Газэты пішуць, што пасьля першага паседжаньня парлямэнту, на якім будзе звалены ўрад Балдвіна, будзе зроблены перарыў да канца месяца, у часе якога ўтворыцца ўрад Макдональда. Першымі мэтамі апошняга, як казаў ён сам, будуць урэгуляваньне адносінаў з контынэнтам (чытай: франка-нямецкая справа) і *юрыдычнае прызнаньне С.С.Р.Р.*

ФРАНЦЫЯ.

У часе найвялікшых пасьпехаў п. Пуанкарэ францускі франк пачаў катастрафічна спадаць. Урад сабраў вялікую канфэрэнцыю знаўцаў, каб далі рады гэтай пагрозе зруйнаваньня ўсяго краю. Прэса п. Пуанкарэ вінаваціць ува ўсім... пабітую і зруйнаваную Францыяй Нямеччыну!..

Неспадзяваны разьліў ракі Сэны затапіў частку Парыжу, нарабіўшы шмат шкодаў; многа ахвяраў.

Адбыліся выбары да франц. Сэнату, нязначна зьмяніўшыя склад апошняга. Павялічыўся з 1 да 4 лік сэнатараў сацыялістаў.

ГРЭЦЫЯ.

Вэнізэлёс адмовіўся ад паста прэм'ера, і выбраны 345 галасамі з 385 маршалкам парляманту, але фактычна стаў дыктатарам у Грэцыі.

У краі будзе паводле рашэньня Вэнізэлёса праведзены плебісцыт, каб народ сам адказаў, ці ён хоча манархіі з тым самым каралём, ці з другой дынастыі (роду), ці зусім мае ўжо па горла манархіі і жадае рэспублікі. З таго, што Вэнізэлёс згадзіўся, каб гэтае пытаньне вырашыў толькі што выбраны ў часе рэвалюцыі парлямант, відаць, што ён ня вельмі моцна верыць у грэцкую рэспубліку, можа галоўна з прычыны перашкодаў з боку Антанты, якая падтрымлівае грэцкага караля.

МАЛАЯ АНТАНТА.

Сяньня пачынаецца новая канфэрэнцыя Мал. Антанты. Як пішуць чэскія газэты, галоўным пунктам канф. будзе справа **фармальнага прызнаньня С.С.Р.Р.**, якая зрабілася найбольш актуальнай пасьля заяўленьня Макдональда, што Англія гэтае зробіць першым чынам. Белградзкая і пражская прэса падчырківае, што пытаньне аб уваходзе новых дзяржаў (Польшчы?..) да саюзу М. Антанты выключана з абрадаў...

БАЎГАРЫЯ.

Выгнаны з Баўгарыі цар Фэрдынанд папрасіўся, каб ўрад пусьціў яго вярнуцца ў край, як звычайнага грамадзяніна. Як пішуць, урад мае згадзіцца.

ЮГАСЛАВІЯ.

Рыхтуецца ў хуткім часе заключэньне гэткага самага саюзу з Францыяй, які апошняя зрабіла з Чэхіяй. Зьмест саюзу — лучнасьць дзеяльнасьці абодвух генаральных штабаў і недапушчэньне Гогэнцолернаў на нямецкі трон.

ВЭНГРЫЯ.

У м. Кронградзе кінуты бомбы, нарабіўшыя шмат бяды. Падазрэньне—на арганізацыю „Прабуджаючаяся Вэнгрыя“; правадыр арганізацыі Іван Гаяс аднак адкідае закіды паліцыі.

Праца над фінансавай санацыяй ідзе напярод, заграпічная пазычка гарантавана. Апошняй справай займецца і пачаўшаяся канф. Мал. Антанты.

С. С. Р. Р.

„Пагроза“ амаль ужо ня стаўшага на прэм'ерскае крэсла Макдональда — прызнаць першым крокам С.С.Р.Р., зусім перапалохала Францыю, якая цяпер сьпяшыць абагнаць у гэтым кроку Англію. „Скрытна“ ад „саюзнай“ Англіі ў Парыжы вядуцца аб гэтым перагаворы, аб якіх вельмі дакладна абвяшчаюць ангельскія газэты... Зразумела, што радавы ўрад цягне з гэтай пасьпешнасьці Францыі ўсе магчымыя карысьці, вытарговываючы найвыгаднейшыя для С. С. Р. Р. варункі...

З Польскага Сойму.

Прамова п. Б. Рагулі ў часе дыскусіі над уставам аў паўнамоцтвах для Прэзыдэнта Польскай Рэспублікі б справе направы скарбу.

Ужо ў працягу пяці гадоў лёс нашага народу зьвязаны з лёсам польскага народу. За гэты час наш народ не атрымаў ніякіх правоў, а толькі абавязкі, мы цяпер ня бачым, каб урад пашоў на спатканьне патрэбам беларускага народу.

Пан старшыня міністраў адносна да нацыянальных меншасьцяў заявіў, што яго аснаўным заданьнем зьяўляецца перадусім направа скарбу, а пасьля ўжо палітычныя рэформы. Гэта формула Сталыпіна: „Перш успакаеньне, а пасьля рэформы“. Гэта нас задаволіць ня можа, бо добра ведаем, што пасьля

жыцьцё ня толькі ўжо паноў, але і мужыкоў, або тых і другіх ў перамежку, трактуючы гэнае жыцьцё з рэальнасьцю і апісваючы праўдзіва, пераважна ўжо без ідэалізацыі.

Вось гэныя апошнія творы, асабліва апісваючыя жыцьцё сялян, ў якіх верна прадстаўлены гаротны быт беларускага мужыка з яго умысловай цёмрай і забабонамі, ягоныя заняткі, абычаі, злыбяды і гульні, ў якіх пекна адмалёвана сумная краса беларускае прыроды, у якіх гутарка сялян або мяшчан, як у запраўдным жыцьці, вядзецца пабеларуску, або ломанай польшчынай, ў якіх ўрэшце прыводзяцца ў арыгінальнай форме, або ў перакладзе цэлыя кавалкі беларускіх народных песьняў — гэткія—кажам — творы, зьяўляюцца найбольш цэннымі і іх трэба перакласьці ў першую чаргу!

Пераважна гэта будуць повесьці і раманы, якія, як мы ўжо раней казалі, найбольш патрэбны і якія, як прозу, найлягчэй перакласьці.

Знойдуцца там і апавяданьні.

Да першых, старэйшых пісьменьнікаў трэба аднесьці прадусім 1) A. Mickiewicza (з ягоных твораў для беларусаў найбольш цікаўны паэмы: „Dziady“, асабліва іх чыста беларуская II-гая, пераложанная праз Н. Арсеньневу, і часткова I-шая часьці; пасьля „Pan Tadeusz“, часткова пераложаны праз Марцінкевіча і Ельскага, ўрэшце на некаторыя дробныя вершы, асабліва з цыклю „Ballady i Romanse“), пасьля 2) J. Czeczot (вершы, заснованыя на запісаных, або пачутых ім беларускіх народных песьнях). 3) I. Chodźko (obrazy i podania litewskie), 4) A. Chodźko (вершы), 5) J. Kraszewski (варта перагледзець ягоныя шматлікія повесьці і раманы, гістарычныя і бытавыя), 6) A. Odyniec (паэзія), 7) Syrokomla (Паэмы: Jan Dęboróg, Ułas, Lirnik wioskowy і іншыя; некаторыя вершы), 8) W. Pol (ў паэме „Pieśni o ziemi naszej“ паміж іншымі краінамі, адно мяйсца прысьвячае апісаньню Беларусі), гэны аўтар выняткова не „kresowy“, а родам з Галіцыі, 9) J. Słowacki (паэма „Rozmowa z matką Makryną Mieczysławską“, апісваючая мучаніцтва ўніятаў, апавяданьні Swięcone u J. O. ks. Radziwiłła Sierotki, Peregrynacja do Ziemi św. — таго-ж князя; ўрэшце пара адрыўкаў паэмаў, на тэмы Міцкевіча), 10) H. hr. Rzewuski (Pamiętniki Soplicy—цыкл апавяданьняў), 11) H. Sienkiewicz („Potop“ — гістарычны раман, ў якім гэроям ёсьць спольшчаны беларускі шляхціц з Оршы Андрэй Кміціц, а гэраіняй яго нарачоная, беларуская-ж шляхцянка Олька Білевічанка; пасьля апісаньне экскурсыі ў Белавескую пушчу).

Апрача памянёных варта перагледзець творы J. Koczeniowskiego і Z. Kaczkowskiego (повесьці гістарычныя і бытавыя).

Да другіх, навейшых пісьменьнікаў належаць прадусім: 1) E. Orzeszkowa, даўшая цэлы рад чыста беларускіх повесьцяў, навэл і раманаў. (Гэткімі будуць повесьці 1) Nad Niemnem. 2) Dziurdziowie. 3) Cham. 4) Niziny. 5) Anastazja. 6) Bene naci дый навэлы, з якіх „W zimowy wieczór“ ўжо перакладзена і прырыхтавана да беларускай сцэны).

2) M. Rodziewiczówna, ў сваіх творах абняўшая шырока, кахаючай душой ўсенькія літоўска-беларуска-украінскія „Kresy“ і адмаляваўшая добра быт кожнага з памянёных тут народаў. (Для беларусаў найбольш цікавы раманы: 1) Byli i będą, 2) Klejnot, 3) Pożary i zgliszcza; і зборнікі навэлаў пад назоваў „Z głuszy“ і „Czarny chleb“), 3) H. hr. Weysenhoff (Раман „Puszcza“; варта перагледзіць і іншыя рэчы. Аўтар дае пекныя, мастацкія малюнкі беларускай прыроды і тутэйшага жыхарства). Гэныя тры аўтары ёсьць найцэньнейшымі і іх трэба перакласьці прадусім і неадкладна. Пасьля ідуць: 4) H. Mniszek (раман „Vertè“), 5) H. Ròmerowa („Swoi ludzie“ збор апавяданьняў), 6) H. Szpyrkòwna („Juziukowa niedziela“, і іншыя рэчы). Трэба перагледзіць і іншыя творы гэных трох пісьменьніц, асабліва апошняй, ды-й наагул кожнага польскага аўтара з беларускіх „kresów“—заўсёды можна ў іх штось знайсьці.

У канцы пазволім сабе заклікаць да гэнае карыстнае для Беларусі працы над перакладамі ўсю беларускую інтэлігенцыю, як старшае грамадзянства так і вучашчуюся моладзь, памятаючы на тое, што чым вышэйшай і багацейшай будзе беларуская культура, тым хутчэй беларусы, згодна з заклікам нашага паэта Янкі Купалы, працярэбяць сабе сьлед „к свабодзе, роўнасьці і знаньню!“

Язэп Сьветазар.

Станыпіна быў Макараў, які сказаў: „так было і так будзе“. Мы не сумляваемся, што пасьля п. Грабскага прыдзе польскі Макараў, які скажа гэта і застасуе да беларускага народу вышэйсказаны лёзунг.

Чуем шмат пекных слоў, як „вольныя з вольнымі і роўныя з роўнымі“, „за вашу і нашу свабоду“, але за імі хаваюцца забойчыя для нашага народу чыны. Ад нашага народу заўсёды вымагаюць падаткаў, падаткаў і толькі падаткаў, але ў замену за падаткі народ беларускі нічога не атрымаў і не атрымоўвае. Заместа зямлі—абдарылі асаднікамі, што пазбаўляе нас усялякай надзеі на заспакаеньне нашага зямельнага голаду. Край наш не адбудоўваецца, люднасьць жыве ў норах і ямах. Дрэва на адбудову наш народ не атрымлівае, а калі хто просіць, дык, як гэта было ў Навагрудку, яму адказваюць, што перш трэба даць асаднікам. Заместа самаўрадаў маем старастаў і войтаў, бежанцаў з-за кардону, якіх наш сялянін павінен карміць дзеля таго, што яны страцілі свае маёнткі ў Радавых Рэспубліках. Школаў ня маем і мець ня можам, бо адміністрацыя ўсялякімі спосабамі перашкаджае іх адкрыцьцю. А нашая інтэлігенцыя, у пераважнай большасьці дзеці мясцовага сялянства, ня могуць атрымаць абыватэльства і выкідаюцца заграніцу. Яшчэ больш: цэлая вёска Жукаўка, Хаценчыцкай гміны, Вялейскага пав. ня можа атрымаць абыватэльства, а толькі права азылю.

Беларусаў, асабліва праваслаўных, выкідаюць з дзяржаўных установаў пад відам рэдукцыі, альбо адсутнасьці абыватэльства. Цэрквы забіраюцца пад касьцёлы, альбо запячатваюцца ці проста разбурваюцца, як гэта было ў Новым Двары, Сакольскага павету, дзе царкву разбурылі і дасюль не адбудавалі. Адным словам у Польшчы ня маем ніякіх правоў, а толькі абавязкі, нават больш, чым можам выпаўніць.

Будучы глыбока пераконаны, што гэты закон новым цяжарам ляжа на наш зьнішчаны край і аграблены народ, не даючы нічога, што магло-б заспакоіць патрэбы нашай люднасьці, будзем галасаваць проціў гэтага закону, ня ўносячы ніякіх папраўак, бо гэтыя папраўкі ня могуць перарабіць закону так, каб ён быў згодны з нашымі жаданьнямі.

З газэт.

„Вялікая хвіга“.

Украінская часопісь „Сялянская Доля“ застанаўліваецца над тэй зьменай у настроях працоўнага украінскага народу, якая адбылася ў працягу леташняга году:

> „1923 год застаў нас у такім-жа палажэньні, як і цяпер. Таксама, як і цяпер нашыя землі былі разрэзаны кардонамі, таксама наш народ на розных землях нёс ярмо няволі. Нават таксама мы былі пераконаны ў сваім праве на ўласнае самастойнае жыцьцё. Але...
>
> „... Здурманеныя капіталістычнымі весткамі пра пекла на Усходзе, мы забываліся аб той сьцяне, што магла нам даць апору ў нашых змаганьнях за нашую мэту;—мы забываліся аб нашым сэрцы і душы — аб галоўным пні нашага народу. І ў той-жа час мы, як цюцькі, ўзіраліся на засланы сытны стол сусьветнага капіталу й чакалі, ці не перападзе з яго і нам што-небудзь. Мы чакалі:—а вось скажуць самаазначайцеся; а вось не зацьвердзяць Рыскага трактату; а вось дадуць нам сваю дзяржаву ў Галіччыне. І дачакаліся такое здаравеннае хвігі, што йшчэ й дасюль круцім носам!“

І гэтая „хвіга“, гэтае выцьверажэньне ад хмелю надзеяў на капіталістычны Захад, бязумоўна, як і ў нас у Заходняй Беларусі, трэба разглядаць як дадатняе зьявішча, якое заставіла народ разьлічаць толькі на свае ўласныя сілы і распачаць працу па арганізацыі гэтых сілаў. І газэта ставіць гэткія заданьні на 1924 год:

> „Згуртуйцеся, як адзін ў сваёй сялянска-работніцкай арганізацыі! Занясеце прамень сьвятла ў найцямнейшы куток вашай зямлі! Станьце аднэй сьцяною ў абароне сваіх правоў! Ня схіляйце сьцягу, калі ўдары лёсу будуць падаць на вас! Ня пужайцеся страхаў, якімі пужае вас на вашым шляху сусьветны „пан“! Не зварочвайце з гэтага шляху, калі церні будуць калечыць вам ногі!“

Усё гэтае можна сказаць і аб нашым народзе, гэта перажылі і мы ў 1923 г., з гэтымі-ж лёзунгамі ўвайшлі ў новы 1924 год.

З УСЯЕ БЕЛАРУСІ.

ХРОНІКА.

Паседжаньне ПрэзыдыумУ Ц. Б. Ш. Рады. 8-га гэтага студня, адбылося паседжаньне Прэзыдыуму Цэнтральнай Беларускай Школьнай Рады. Разглядаліся бягучыя справы, а асабліва праектуемыя зьмены ў арганізацыі Віленскай Беларускай Гімназіі і яе буджэт.

Зачыненьне Несьвіскай Беларускай Гімназіі. Несьвіская Беларуская Гімназія пасьля доўгага змаганьня за сваё істнаваньне ўрэшце зачынена па загаду Палескага Куратара. Куратар перш, лічучы Беларускую Гімназію ў Несьвіжы непатрэбнай, ня даў быў канцэсіі быўшаму канцэсыянэру п. Жаўнеркевічу. Пасьля лічных заяваў ад бацькоў вучняў аб неабходнасьці істнаваньня Беларускай Гімназіі, Куратар згадзіўся даць новую канцэсію, ставячы рад варункаў. Па меры выпаўненьня гэтых варункаў высоўваліся новыя, а асабліва справа адпаведнага памешканьня. Памешканьне, якое раней займала гімназія, было разам з інвэнтаром, забрана пад польскую ўрадовую школу. Памешканьне, якое займала гімназія ў леташнім годзе, куратарыум прызнаў неадпаведным. Прыймаючы пад увагу труднасьць у Несьвіжы, асабліва ў сярэдзіне школьнага году, знайсьці памешканьне, якое-б задаволіла-б вымаганьні п. Куратара, гэты варунак можна ўважаць за замаскаванае жаданьне ўлады зачыніць Несьвіскую Гімназію, чаго яна ўрэшце і дабілася. Беларуская Гімназія ў Нясьвіжы ўжо ня істнуе. Гэта цяжкая страта для нашага народу, які ўсімі спосабамі пазбаўляецца магчымасьці атрымаць асьвету ў роднай мове.

Але група быўшых вучыцялёў гімназіі пастанавіла ўжо цяпер распачаць крокі, каб падрыхтаваць грунт да адчыненьня Беларускай Гімнасіі ў будучым годзе. Прымаюцца ўсе меры, каб перамагчы тыя перашкоды, дзякуючы якім гімназія прымушана была зачыніцца. Аднэй з важнейшых перашкодаў, як мы ўжо казалі, зьяўлялася адсутнасьць адпаведнага памешканьня. Каб забясьпечыць для гімназіі памешканьне, патрэбны значныя грошы, за якія-б можна было-б купіць альбо заарэндаваць будынак. Беднасьць нашага грамадзянства зьяўляецца гэтаму перашкодай. І вось, група быўшых вучыцялёў Несьвіскай Гімназіі зварочваецца праз Ц.Б.Ш. Раду, да ўсіх беларусаў, а асабліва замежных у Амэрыцы і Латвіі, зьбіраць ахвяры на фонд Беларускай Гімназіі ў Несьвіжу, якія складаць у Цэнтральнай Беларускай Школьнай Радзе, (Вільня, Віленская 12. п. 6).

Справа беларускай школы вельмі важныя, і, кожны беларус павінен адклікнуцца і злажыць пасільную ахвяру на гэтую мэту, памятаючы, што нам ніхто не дапаможа, апрача нас саміх.

Хворасьць гр. А. Луцкевіча. Вядомы беларускі дзеяч і культурны працаўнік Антон Луцкевіч ад даўжэйшага ўжо часу чуў сябе ня зусім здаровым. Цяпер, згодна з радай дактароў, гр. Луцкевіч выехаў лячыцца ў Закапанае (ў Татрах).

Мітынгі. У працягу студзеня месяца гэтага году пасол М. Кахановіч ладзіць рад справаздаўчых мітынгаў у Зьвярынцы ў Вільні.

Беларуская Цантральная Школьная Рада ў Вільні, маючы на мэце арганізацыю беларускіх пачатковых і сярэдніх школаў, а такжа беларускіх вучыцельскіх курсаў, аб чым робяцца захады перад Уладай, гэтым зварочваецца да ўсіх настаўнікаў-беларусаў як працуючых ў школах, так і непрацуючых, каб далі аб сабе весткі, запоўніўшы ніжэйпаданую анкету.

1) Імя і прозьвішча.
2) Век, або калі радзіўся.
3) Што скончыў.
4) Стаж (колькі гадоў вучыў і ў якой школе).
5) Ці скончыў беларускія курсы.
6) Як прыгатаваны з полёністыкі.
7) Чым цяпер займаецца.
8) Адрэс.

Запоўніўшы гэткую анкету паводле вышэйпададзенага ўзору Б. Ц. Ш. Р. у Вільні просіць прыслаць яе па адрэсу: Wilno, Wileńska 12—6. Białoruska Gentralna Rada Szkolna.

Бел. Цант. Шк. Рада
ў Вільні.

Дописы.

Беларусы у Амэрыцы.

(Ад уласнага карэспандэнта).

Вялікі беларускі вечар у Чыкаго.

У нядзелю, 2 сьнежня 1923 г. у вялікай залі Волшэс адбыўся надзвычайна прыгожы канцэрт-баль на карысьць сірот Заходняй Беларусі. Камісія Беларускага Народнага Таварыства па арганізацыі гэтага дабрачыннага канцэрт-балю ў складзе: А. Змагара, П. Міхайлоўскага, Я. Курдзёнка, І. Зырко і Я. Жука шмат палажыла працы дзеля ўсьпеха помачы нашым бедным дзеткам. Яшчэ задоўга да пачатку, канцэртная заля стала напаўняцца народам, прыехаўшым на гэтае беларускае сьвята нават з суседніх штатаў. За некалькі мінут да пачатку ўжо заля Волшэс не магла памесьціць усіх жадаючых быць прысутнымі на канацэрце. Роўна а 4 гадзіне канцэрт пачаўся гучнай мэлёдыяй беларускай марсельёзы „Ад веку“... у выкананьні духовай капэлы Я. Барабаша. Усе прысутныя ўстаюць... і быццам з ўсіх грудзёў хоча вырвацца крык пратэсту: „мы ўжо даволі цярпелі — цярпець больш ня будзем“...

Затым Я. Варонка, вядомы дзеяч, сказаў гарачую прамову на тэму: „Амэрыка і Беларусь.“ Емка-выразным беларускім словам, ён указаў на значэньне Амэрыкі ў вялікім дзеле адраджэньня Чэхіі, Літвы, Латвіі і Польшчы, далей адзначыў перад амэрыканскімі беларусамі, якая на іх ляжыць адказнасьць перад гісторыяй Беларускага Народу ў справе помачы Беларусі ў сучасны цяжкі мамэнт. Другім прамоўцай быў др. О. Назарук, яго прамова была на тэму: „Украіна і Беларусь“. Украінскі дэлегат адзначыў супольнасьць інтарэсаў беларусаў і украінцаў ў цяперашняй сучаснасьці, якімі абодва народы павінны йсьці у барацьбе за лепшую будучыну. Артыст-беларус Маскоўскай і Італьянскай Опэраў С. Бароўскі прапяяў значны лік беларускіх і расейскіх рамансаў, народных песьняў і опэрных фрагмэнтаў. Надзвычайна мілае ўражаньне зрабіў украінскі хор над кіраўніцтвам грам. Д. Атаманца. Духавая капэла пад кіраўніц. Я. Барабаша выканала мэлёдычна „букет пьсе“. Балерына В. Бароўская сваімі пластычнымі танцамі ўпекніла праграму вечара. П. Патапенко сваім выступленьнем на гармоніку навеяў успаміны аб родных вечарынках у далёкай беларускай вёсцы.

У другой часьці праграмы выступілі з дэклямацыямі беларускія дзеці: С. Леванюк („Хто сказаў і я з народам“), Н. Бузюк („Да Беларусі“), Н. Салавей („Нёман“) і М. Лаўда („Слуцкія ткачыхі“). На дэклямацыю дзяцей у пекных беларускіх нацыянальных касьцюмах—грамадзянства адказала гучнымі воплескамі. Танцы балерыны Кэтті — таксама нарабілі многа шуму. Але надзвычайна усіх насьмяшыў дырэктар цырка Цэзар Арігонні. Апошнім нумарам было зноў адыграньне капэлай П. Барабаша некалькі музыкальных нумароў. Затым грам. А. Змагар ад імя Беларус. Народн. Таварыства падзякаваў усім сабраўшымся за матар'яльна-маральнае падтрыманьне гэтага беларускага вечара на карысьць сірот Заходняй Беларусі. Пасьля распачаўся баль, які зацягнуўся да позьняй ночы. Грамада разышлаея ў мілым настрою. Усе былі задаволены сваім прадпрыемствам і тым, што выпаўнілі абавязак перад тымі дзяцьмі, чакаючымі помачы. Матар'яльны ўсьпех быў добры. Такім чынам на просьбу самых дзетак і Камітэту Помачы пацярпеўшым—чыкагскія беларусы зрабілі ўсё, што маглі.

Я. Ч.

Чыкаго, 1923 г. 4 сьнежня.

Рэдактар-Выдавец М. Шыла.

Друкарня Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.